# КАНФЕРЭНЦЫЯ БЕЛАРУСАЎ(-АК) СВЕТУ IV

23–25 траўня

Варшава

## Вынікі

# Падтрымка палітвязняў і беларускіх дабраахвотнікаў

## Комплексная падтрымка палітвязняў у выгнанні Рэсацыялізацыя і “кропкі ўваходу”

Асноўны фокус групы — падтрымка былых палітвязняў у выгнанні, у тым ліку інфармацыйная, сацыяльная і псіхалагічная.
“Кропкі ўваходу” — цэнтры ці сістэмы, куды чалавек можа звярнуцца адразу пасля вызвалення.

Праблемы:
- Няма адзінага механізму альбо платформы.
- Частая змена кантактаў, акаўнтаў.
- Брак рэсурсаў на суправаджэнне.

Прапановы:
- Папулярызацыя і развіццё “кропак уваходу”.
- Уніфікацыя і каардынацыя паміж дапаможнымі арганізацыямі.
- Сетка дапамогі “чарнобыльскім” — як узор (Нямеччына, Ірландыя, Італія).
- Падтрымка не толькі фінансавая, але і працаўладкаванне, каб пазбегнуць рызыкі “дармаедства”.
- Стварэнне асобных праграм для цяжкахворых (онка, пратэзы, імунныя захворванні).
- Ініцыятыва “зубы” — сетка беларускіх стаматолагаў у ЕС, гатовых працаваць pro bono.

### 1. МІЖНАРОДНЫ ГУМАНІТАРНЫ ФОНД І ФІНАНСАВАННЕ

Мэта: Прасоўванне ідэі стварэння/мадыфікацыі Міжнароднага гуманітарнага фонду (МГФ).

Цяперашняя праблема: МГФ прымае сродкі толькі ад дзяржаў.

Прапановы:
- Дазволіць фінансаванне ад юрыдычных і фізічных асоб.
- Правесці інфармацыйную кампанію па прасоўванні ідэі МГФ.
- Пошук іншых механізмаў падтрымкі, у т.л. з боку прыватнага сектару.

### 2. КАМУНІКАЦЫЯ І ІНФАРМАЦЫЙНАЯ ІЗАЛЯЦЫЯ

Праблемы:
- Палітвязні часта не ведаюць, куды звяртацца.
- Улады спецыяльна перапыняюць сувязь, выкарыстоўваюць страх і запалохванне.

- Зняволеныя выкарыстоўваюцца супраць іншых — праз “крымінальнікаў” ці агентаў у калоніях.

Прапановы:
- Удасканаленне скрытай камунікацыі і эвакуацыйных скрыптоў.
- Распрацоўка адукацыйных матэрыялаў для зняволеных і іх сем’яў.
- Больш публічных гісторый поспеху, каб перамагчы страх.
- “Вольныя” — структура ментарскай падтрымкі як станоўчы прыклад.

**ПАЛІТВЯЗНІ-ГРАМАДЗЯНЕ УКРАІНЫ**

Станам на сёння:
- 14+ грамадзян Украіны у беларускіх турмах.
- 1 чалавек адбыў тэрмін, дэпартаваны, цяпер у Чэхіі.

Праблемы:
- Адсутнасць права на часовую абарону ў ЕС (бо падчас пачатку вайны знаходзіліся ў турмах).
- Няма юрыдычнага шляху да міжнароднай абароны.
- Пагроза мабілізацыі пры вяртанні ва Украіну.

Прапановы:
- Стварэнне праграм легалізацыі ў ЕС для такіх асоб.
- Адвакацыя за іх вызваленне, перадачу або статус уцекача.
- Увага да гэтай групы як грамадзянская адказнасць Беларусі (бо яны пацярпелі часткова праз наш супраціў).

**ПАДТРЫМКА І ПРАВАВЫ СТАТУС БЕЛАРУСКІХ ДАБРАВОЛЬЦАЎ ВА УКРАІНЕ:**

Праблема:
- Прававы вакуум. Пасля службы няма механізма прызнання або абароны.

Прапановы:
- Рамкі закона аб беларускіх добраахвотніках ва Украіне (рэк. ад АПК і ОСТЦ).
- Заклік ствараць рабочыя групы і далучаць да распрацоўкі заканадаўства.
- У краінах ЕС:

Статусы:
- Літва — няма статусу.
- Польшча — часткова ёсць.
- Чэхія — станоўчы прыклад.

Прапановы:
- Адвакацыя на нацыянальным узроўні ў кожнай краіне.
- Забеспячэнне юрыдычнай аховы і прызнання.
- Прасоўванне іміджу беларускіх добраахвотнікаў як ваяроў за дэмакратыю.

**ПСІХАЛАГІЧНАЯ І САЦЫЯЛЬНАЯ ПАДТРЫМКА СЕМ’ЯЎ**

Праблема:
- Недастатковая ўвага да сем’яў тых, хто:
    - Загінуў на вайне.
    - Прайшоў вайну і вярнуўся.
    - Знаходзіцца ў палоне.

Прапановы:
- Праграмы псіхалагічнай рэабілітацыі.
- Сацыяльная і матэрыяльная падтрымка.
- Прызнанне гэтых сем'яў як роўнапраўных атрымальнікаў дапамогі.

**РЭАЛЬНАЯ КОЛЬКАСЦЬ ПАЛІТВЯЗНЯЎ І ПАШЫРЭННЕ ВЫЗНАЧЭННЯ**

Неабходна:
- Актуалізаваць колькасную статыстыку палітвязняў.
- Прызнаваць эканамічных зняволеных, пакаранне якіх мае палітычную матывацыю.
- Улічваць шырокі спектр форм пераследу і рэпрэсій.

## АГУЛЬНЫ ПАСЫЛ

> «Калі дапамога ёсць, але людзі не звяртаюцца — значыць, ёсць праблема. Мы павінны гаварыць, ствараць, аб'ядноўваць. Гэтыя людзі сядзяць не толькі за сябе — але і за нас.»

# Легалізацыя, мабільнасць, бяспека

## Пытанні:

1. **ПРАТЭРМІНАВАНЫЯ ПАШПАРТЫ.**
Самая актуальная праблема для беларусаў за мяжой. Якія ёсць варыянты вырашэння праблемы:

**1.1. Атрымаць пашпарт замежніка ці трэвэл дакумант.** Ён даступны амаль ва ўсіх краінах Еўразвязу (акрамя Латвіі, Кіпра, Балгарыі). Поўны спіс дакумантаў для замежнікаў. Інструкцыя, як атрымаць пашпарт замежніка.
Каб даказаць немагчымасць атрымання беларускага пашпарта за мяжой можна:
- пераклад Указа №278.
- ліст ў амбасаду бсср і адказ або адсутнасць адказу
- спасылкі на мясцовыя медыя або пісьмо ад НА с тлумачэннямі на мясцовай
Даказаць немагчымасць паездкі ў Беларусь:
- прыкладаць дакумант аб небяспецы вяртання
- прыватныя рызыкі (удзел, лайкі, фота,...)
- агульная небяспечнасць Беларусі для ўсіх беларусаў: любы дакумант пра сітуацыю ў рб ад аан, ПАРЭ, АБСЕ. Бібліятэка

**1.2. Падавацца на міжнародную абарону.** Нават статус суіскальніка дае права на легальнае знаходжанне ў краіне, хоць і без права яе пакідаць.
Каб даказаць, што Беларусь небяспечная краіна можна выкарыстоўваць міжнародныя дакументы. Вельмі важна, каб міграцыйныя службы карысталіся актуальнай інфармацыяй аб сітуацыі ў Беларусі.

2. **ДАВЕДКІ, АПАСТЫЛІ, ДЫПЛОМЫ.**
Заканадаўства шмат якіх краін дапускае замест арыгіналаў даведак і апастыляў напісаць заяву, чаму гэта немагчыма, прыкласці доказы небяспекі вяртання ў Беларусь.

3. **БЯСПЕКА БЕЛАРУСАЎ ЗА МЯЖОЙ.**
3.1. Пры планаванні вандровак абірайце бяспечныя для беларусаў краіны, якія ня маюць дамовы аб выдачы беларусаў. Праверыць бяспечныя краіны можна на сайтах https://pashpart.org/travel.html і https://safetravel.legin.info/
3.2. Трэба памятаць, што калі вы ў вышуку Інтэрпол, вас могуць арыштаваць нават ў краіне Еўразвяза, хоць ніводнака выпадку экстрадыцыі пакуль не было. Пры затрыманні, звяртайцеся да профільных адвакатаў, публічце гэтую інфапрмацыю, карыстайцеся дакумантам, дзе прыведзены доказы, што Беларусь не з'яўляецца бяспечнай краінай для экстрадыцыі, звяртайцеся ў праваабарончыя арганізацыі і Народныя амбасады (help@belarusabroad.org)

4. **ВІЗЫ ДЛЯ БЕЛАРУСАЎ.**
Шмат якія краіны маюць спецыяльныя ўмовы для сваякоў палітзняволеных і актывістаў, якія ня могуць вярнуцца. Дамагчыся гэтага дапамаглі калектыўныя запыты ў МЗС краін, адвакацыйныя кампаніі.

5. **ПРАБЛЕМЫ З БАНКАЎСКІМІ РАХУНКАМІ.**
Калі банк адмаўляецца адкрываць фізічнай асобе разліковы рахунак, вы можаце папрасіць адкрыць асноўны банкаўскі рахунак (basic bank account) і банк не зможа вам адмовіць без сурʼёзных прычын, якія павінен паведаміць.

6. **ДЫСКРЫМІНАЦЫЙНЫЯ ПРАКТЫКІ СУПРАЦЬ БЕЛАРУСАЎ ПА НАЦ. ПРЫКМЕТАМ І ЯК З ГЭТЫМ ЗМАГАЦЦА.**
Калі фізічнай асобе ці юрыдычнай асобе адмаўляюць на падставе беларуснай нацыянальнасці, то гэта можа быць парушэннем нацыянальнага заканадаўства і дырэктывы Еўразвяза аб недыскрымінацыі. У кожнай краіне ёсць амбудсмен ці спецыяльная камісія, якая прымае скаргі аб дыскрымінацыі.

7. **ПРАФЕСІЙНЫЯ ДЫСКРІМІНАЦЫІ**.
Невідавочныя групы ў адрозненні ад журналістаў і юрыстаў пад дыскрымінацыю трапляюць, напрыклад, лекары (немагчымасць атрымаць падцвярждаючыя дакументы) або святары (перaслед за прафесійную дзейнасць).

**Што працуе добра ў адвакацыі:**

- Міжміністэрскія сустрэчы з удзелам дыяспары, Народных амбасадаў і праваабарончых арганізацый,
- Канкрэтныя кейсы і прыклады лепшых практык ў іншых краінах.
- Публічны дакументы, якія могуць выкарыстоўваць ўсе беларусы ў краіне
- Вывучаць законы і шукаць лазейкі. Сістэмаіычны падыход
- Прызнанне Беларусі небяспечнай краінай з боку МЗС і міграцыі.
- Актыўнае лаббіяванне вырашэння праблем беларусаў.

**Арганізацыі**

1. Прававая ініцыятыва. Пытанні: вымушаная міграцыя і правы чалавека. Карта бяспечных падарожжаў. Кансультацыі - ня толькі Польшча і Літва. Бібліятэка дакумантаў. International accountability platform
2. ОСЦ. Любыя пытанні. Па пашпартам - ў Грузіі паставіць візу у пратэрмінаваны пашпарт, калі падаваліся на ахову. Прызнанне трэвэл-дакумантаў Польшчы на Кіпры. Верыфікацыя і выдача даведак.
3. Народныя амбасады. Мы не юрысты, мы сетка - досьвед 15 краін, лепшыя практыкі. Ведаем нюансы па краінах, робім адвакацыйныя кампаніі. pash-part.org кантакты, канкрэтныя кейсы. Сістэма маніторынга Люксембургскіх рашэнняў.
4. КР - Праўная камісія - індывідуальныя запыты - перанакіроўваем запыты. Калектыўныя запыты. Атрыманне віз для родзічаў уцекачоў (Гародня і Берасце). Міжнародная камісія - адвакацыя ў ПАРЭ, ЕК, Радзе Еўропы, Кангрэсе, парламентах.
5. Партызанка. Транснацыянальныя рэпрэссіі - фэйкавыя лісты пагроза нацбяспекі. Пагаршаецца у Польшчы сітуацыя з МА. Новы міграцыйны пакт
6. АПК (і НАУ) Двухбаковая прац група па пытаннях легалізацыі. Латушка, Мацієўская. - Звяртацца Чат-бок Кабінета і НАУ. Пенсіі для уцекачоў. Часовыя пашпарты.

**Карысныя спасылкі:**
- *Pashpart.org:* пашпарты замежніка, міжнародная абарона, бяспечныя патаванні, шлюбы (будзе дапаўняцца)
- *Прававая ініцыятыва*
- *Народныя амбасады*
- Партызанка - юрыдычная інфармацыя.
- Па Украіне - ТГ канал (Вольга Карпушонак)
- *Партал,* які акумулюе ўсю інфармацыю аб краіне паходжання. менавіта яго выкарыстоўваюць для ацэнкі бяспекі

**Дакументы:**
- Люксембургскія рашэнні
- Лепшыя практыкі вырашэння праблем беларусаў у краінах Еўразвяза
- “Небяспека вяртання у Беларусь”
- Бібліятэка матэрыялаў пра Беларусь
- Belarus - ecoi.net
- Бяспечныя падарожжы
- Пашпарты замежніка і трэвэл дакументы
- The Republic of Belarus cannot be considered a safe country for deportation.pdf
- Банкаўскія рахункі

## ІНШЫЯ ПЫТАННІ, ЯКІЯ АБМЯРКОЎВАЛІСЯ ПАДЧАС ПРАЦОЎНАЙ ГРУППЫ:

**Трэнды:**
- Легалізацыя дзяцей (асабліва якія нарадзіліся за мяжой)
- Грузія - якія ёсць магчымасці?
- Бясплатная юрыдычная дапамога не заўсёды эфектыўная. Закрыўся ЦБС
- Якая стратэгія вырашэння міграцыйнаых праблем беларусаў (апатрыд ці разглядаць увогуле).
- Рашэнне еўрапейскага суда па правах чалавека адмаўляецца выконваць Італія + яшчэ 7 краін (дэпартацыя, невыдача).
- Дакументы з Беларусі, неабходныя для працаўладкавання, немагчыма атрымаць.
- транснацыянальныя рэпрэсіі

**Дадатныя пытанні:**
- Гішпанія:  Даведка МЗС, што Беларусь -  небяспечная краіна + інструкцыі ад МЗС ці МУС, як працаваць з беларусамі. Перасталі выдаваць міжнародную ахову.
- Польшча - банкаўскія рахункі без пашпарта. Крэдыты
- Сустрэча ППЛ, Мціеўскай, Карпушонак з Шэфам польскай міграцыі, каб трэвэлдок быў  прапісаны як пасведчанне асобы.
- Банкаўскія рахункі. Амбудсмен па справах недыскрымінацыі.
- Неабходныя дакументы для адкрыцця рахунка - 2 дакумента: пашпарт + ВНЖ ці натарыяльны дакумант + ВНЖ
- Асноўны банкаўскі рахунак. складаннасць - доказ што па нац прызнаку
- Эстонія, Фінляндыя, іншыя - забароны для беларусаў
- Пенсіі для беларусаў у Польшчы

## ШТО МЫ МОЖАМ РАБІЦЬ РАЗАМ?
- Больш абмена інфармацыяй, хто і што робіць.
- Міжнародная адвакацыя па канкрэтнай праблеме, напрыклад - дакумантах.
- Абменьвацца напрацаванымі дакумантамі.
- партнерская праца (прыклад, размяшчэнне спасылак, банэраў)

# Культура і адукацыя

1. **M.B.V.A. — “Make Belarus Visible Again”**
    - Стварэнне пазітыўнага вобразу Беларусі для свету.
    - Адыход ад наратыву «краіны пакуты» да пазітыўнага іміджу «сучаснай, каштоўнаснай, культурна багатай нацыі».
    - Галоўны мэсэдж: беларусы — “Wow-нацыя”, а не толькі народ з Чарнобылем і рэпрэсіямі

2. **Глабальная PR-кампанія**
    - Скаардынаваная камунікацыя пра беларускую культуру, тэхналогіі, асобаў і таленты.
    - Праз прыклады: Касцюшка — нацыянальны герой ЗША з беларускімі каранямі; поспехі беларускіх IT-спецыялістаў і валанцёраў.
    - Падключэнне сацыялогіі і даследаванняў меркаванняў замежных працадаўцаў і ўніверсітэтаў.

3. **Трансфармацыя ідэнтычнасці**
    - Пераход ад тэрытарыяльнай ідэнтычнасці (нарадзіўся ў Беларусі) да маральна-каштоўнаснай / культурнай (наследнік ВКЛ, Купалы, Каліноўскага).
    - Падтрымка гэтага праз адукацыю, культуру, сімвалы, падзеі.

4. **“Мяккая сіла” і культурная дыпламатыя**
    - Беларуская культура як інструмент мяккага ўплыву.
    - Стварэнне прэстыжнага іміджу Беларусі праз культурныя прадукты, удзел у міжнародных форумах (Венецыянскае біенале, Канскі фестываль, Еўрабачанне і інш.).

5. **Беларуская контркультура**
    - Беларускасць як альтэрнатыва савецкаму мэйнстрыму.
    - Асабліва цікава для моладзі: новы культурны код, вартасны змест, незалежнасць.

6. **Эмпатыя як нацыянальная рыса**
    - Беларусы — нацыя з высокім узроўнем эмпатыі.
    - Можна выкарыстоўваць як маркетынгавую фішку (дапамога, салідарнасць, валанцёрства).

7. **Падвышэнне самаацэнкі**
    - Беларусь не прызнае ўласныя дасягненні.
    - Патрэбна псіхалагічная і інфармацыйная кампанія, каб беларусы вучыліся ганарыцца сабой і публічна аб гэтым казаць.

## ТЭМА АДУКАЦЫІ: АДУКАЦЫЯ ПА-БЕЛАРУСКУ Ў ЭМІГРАЦЫІ

### 1. Галоўныя праблемы

- Нізкая матывацыя бацькоў аддаваць дзяцей у беларускія школы/праграмы.
- Недахоп беларускамоўнага адукацыйнага кантэнту для малых дзяцей.
- Сумневы ў якасці і карысці такіх ініцыятыў.
- Пераход дзяцей на мовы і ідэнтычнасці краін пражывання (палякі, літоўцы, немцы і г.д.).

### 2. Напрамкі працы і рашэнн

A. Работа з дарослымі (бацькамі, настаўнікамі)

- Адукацыйныя і камунікацыйныя кампаніі: чаму ідэнтычнасць праз мову важная.
- Павышэнне кваліфікацыі настаўнікаў, распрацоўка інструментаў працы.
- Дыялог паміж адукацыяй, бізнэсам і мецэнатамі (інвеставанне ў адукацыю).

B. Работа з падлеткамі (12–17 гадоў)

- Фокус на стварэнні крутага, актуальнага кантэнту, які будзе цікавы самім падлеткам.
- Падлеткі — аўтаномная аўдыторыя, якая сама прымае рашэнні.

C. Работа з малымі дзецьмі (2–8 гадоў)

- Стварэнне развівальных праграм, мультымедыя, кніг, якія фармуюць свядомасць і ідэнтычнасць з маленства.
- Беларуская мова як частка натуральнага свету дзіцяці.

D. Кнігадрук для білінгваў

- Выданне кніг для дзяцей, якія растуць у іншамоўным асяроддзі.
- Кнігі на беларускай + мясцовая мова.

E. Онлайн-адукацыя

- Развіццё анлайн-платформаў і праграм на беларускай мове.
- Прасоўванне і адаптацыя для розных узроставых і сацыяльных груп.

F. Распрацоўка гнуткіх адукацыйных мадэляў

- Для розных краін, узростаў, установаў.
- Улічваючы дыяспару, магчымасці інтэграцыі ў мясцовыя сістэмы.

## ІНСТРУМЕНТЫ І ПАДТРЫМКА

- Мецэнатства і краўдфандынг: падтрымка беларускамоўных праектаў.
- Рэпрэзентатыўная сацыялогія: даследаванні, якія паказваюць, як беларусаў успрымаюць у свеце.
- Прысутнасць на міжнародных мерапрыемствах: не афіцыйная Беларусь, а Беларусь, якой ганарымся.
- Медыяпраца і дыстрыбуцыя: паказваць вынікі працы, дасягненні, ролевыя мадэлі.

## КАНЧАТКОВЫЯ ВЫСНОВЫ

- У беларусаў ёсць моцны культурны і адукацыйны патэнцыял.
- Неабходна сістэмная, каардынаваная праца над:
- папулярызацыяй беларускай ідэнтычнасці у свеце;
- пашырэннем беларускай адукацыі;
- псіхалагічнай і каштоўнаснай рэабілітацыяй нацыі.
- Ініцыятывы павінны быць сучаснымі, гнуткімі, арыентаванымі на мэтавую аўдыторыю.

# Умацаванне структур беларускай дыяспары

**ПЫТАННІ:**

**Недахоп кадраў і прафесійных кампетэнцый**

У многіх ініцыятывах адчуваецца недахоп людзей з профільнымі навыкамі: менеджараў, IT-спецыялістаў, юрыстаў, псіхолагаў. Гэты дэфіцыт абмяжоўвае магчымасці росту і маштабавання.
Развіццё кадравага патэнцыялу праз навучанне, ментарскія праграмы, абмен вопытам, прыцягненне спецыялістаў з ліку беларусаў за мяжой з’яўляецца крытычна важнай умовай для павышэння эфектыўнасці і ўстойлівасці дзейнасці ініцыятыў.

**Падтрымка былых палітвязняў**

Былыя палітвязні — адна з найбольш уразлівых груп. Пасля вызвалення яны часта застаюцца сам-насам са сваімі праблемамі, без доступу да адукацыі, працы, медыцынскай ці псіхалагічнай падтрымкі.
Менавіта гэтая катэгорыя мае патрэбу ў комплекснай, этычна выбудаванай праграме рэабілітацыі і інтэграцыі.

**ПАЗІТЫЎНЫЯ МОМАНТЫ / НАЗІРАННІ**

- Культурніцкія, моўныя і адукацыйныя ініцыятывы дэманструюць высокі патэнцыял для аб’яднання без рызыкі.
- У многіх краінах ужо існуюць моцныя лакальныя супольнасці.
- Існуе выразны запыт на супрацу, узаемадапамогу і новыя фарматы аб’яднання.

**ПРАПАНОВЫ ПА РАЗВІЦЦІ:**

1. Стварэнне каардынацыйнай платформы
   Аб’яднаць намаганні ініцыятыў з розных краін, каб забяспечыць абмен вопытам, супольнае планаванне, калектыўную бачнасць і падтрымку.
2. Распрацоўка карты супольнасцяў і праектаў
   Сфарміраваць «жывую» базу беларускіх ініцыятыў з падзелам па краінах і тэматыках для лепшага ўзаемадзеяння, стратэгічнага партнёрства і рэплікацыі паспяховых практык.
3. Падтрымка культурніцкіх і адукацыйных праектаў
   Фокус на бяспечныя, адкрытыя фарматы (фестывалі, выставы, моўныя школы, творчыя калабарацыі).
4. Развіццё кадравага патэнцыялу
   Адукацыйныя праграмы, ментарства, гранты на стажыроўкі, прыцягненне прафесіяналаў з ліку беларусаў за мяжой.
5. Праграмы дапамогі былым палітвязням
   Комплексная падтрымка (ад курсаў і псіхалагічнай дапамогі да дапамогі з жыллём і працаўладкаваннем).
6. Удзел бізнесу
   Заахвочванне сацыяльнай адказнасці (спонсарства, ментарства, падтрымка лакальных мерапрыемстваў і ініцыятыў).

**Аб’яднанне беларусаў за мяжой магчымае і неабходнае**

на асновах даверу, культуры, гарызантальнасці і салідарнасці.
Падтрымка ўжо існуючых намаганняў і запуск каардынацыйных механізмаў значна ўзмоцніць устойлівасць і дапаможа справіцца з выклікамі вымушанай эміграцыі.

# Фандрайзінг

## 1. КРЫЗІС ФІНАНСАВАННЯ: ПРЫЧЫНЫ І НАСТУПСТВЫ

**Сітуацыя з рэсурсамі**

- Многія ініцыятывы працуюць ужо 4+ гады без устойлівай падтрымкі.
- Некаторыя з іх — напрыклад, партызанскія ініцыятывы — робяць працу, якой не займаецца ніводная іншая супольнасць у Польшчы,але гэтыя ініцыятывы страцілі падтрымку — матэрыяльную, псіхалагічную і інстытуцыйную.

**Амерыканскі фактар**

- Раней да 50% падтрымкі ў розных сферах ішло з ЗША.
- Цяпер гэтыя сродкі спынены або значна скарачаны.
- Была надзея, што Еўропа замяняе гэты недахоп — але Еўразвяз пераарыентаваў свае бюджэты на абаронныя патрэбы.
- Сродкі ЕЗ не пакрываюць страты, і чакваецца яшчэ большае скарачэнне.

**Стратэгічны выклік**

“Гэта самы цяжкі перыяд за 25 год існавання беларускай грамадзянскай супольнасці.”
(цытата Андрэя Стрыжака)

## 2. ПЕРААРЫЕНТАЦЫЯ: КАМЕРЦЫЙНАЯ ДЗЕЙНАСЦЬ ДЛЯ НДА

**Асноўная ідэя**

Некамерцыйныя арганізацыі могуць весці камерцыйную дзейнасць, калі гэта служыць іх статутным мэтам.

**Што можна рабіць**

- Лекцыі і семінары — выступы ў акадэмічных асяродках (універсітэты, школы, даследчыцкія цэнтры).
- Культурныя івэнты — канцэрты, выстаўкі, дабрачынныя вечары.
- Аўкцыёны — продаж артэфактаў з эмацыйнай і культурнай вартасцю.
- Кірмашы — напрыклад, удзел рамеснікаў у мерапрыемствах у Мілане з платным удзелам і невялікім адсоткам на карысць арганізацыі.
- Асвета і навучанне — уключэнне ў адукацыйныя праграмы пры еўрапейскіх інстытутах.

## 3. ДОСВЕД З РОЗНЫХ КРАІН

### Італія — Юлія

- **Заснавала суполку пасля атрымання статусу ўцекачкі.**
- **Асноўныя крыніцы:**
  - Прафсаюзы — даюць падтрымку асацыяцыі.
  - Рэгіянальныя фонды — фінансуюць нават без конкурсу, проста як падтрымку мясцовай ініцыятывы.
  - Сістэма 5x1000 — падатковая сістэма, дзе грамадзяне могуць накіроўваць 0,5% падатку на карысць грамадскай арганізацыі.
  - Кірмаш у Мілане — удзел беларусаў і збор ахвяраванняў.

“Я больш працую з італьянцамі, чым з беларусамі. Я кажу: мы — ваш рэсурс. Падтрымайце нас, і мы аддадзім у тры разы больш.”

### Чэхія — прадстаўніца меншасці

- **Беларусы з 2013 года маюць статус нацыянальнай меншасці — гэта адкрывае магчымасць для:**
  - Падачы на гранты праз міністэрствы і магістраты.
  - Удзелу ў радах і камітэтах пры ўладзе.
  - Фінансавання для:
    - Параненых дэманстрантаў,
    - Рэпрэсаваных медыкаў,
    - Студэнтаў-палітвязняў.

“Ёсць інструменты, але беларусы мала імі карыстаюцца. Толькі цяпер пачынаем.”

## 4. АЛЬТЭРНАТЫЎНАЕ ФІНАНСАВАННЕ: ІДЭІ, ІНСТРУМЕНТЫ, ПАРТНЁРСТВЫ

**Інавацыйныя метады**

- Беларускі магістрат — група людзей, якая рэгулярна фінансуе пэўны праект. Напрыклад:
  - Перазагрузка выдавецтва Васкевіча (23 000 долараў),
  - Беларускамоўны падлеткавы клуб.
- Klub Belaruski — платформа, якая працуе з прадстаўнікамі бізнеса і спансуе праекты па тэматыках: інклюзія, адукацыя, дапамога ўцекачам.
- Дабрачынныя артэфакты — прыклад: рэчы, што маюць сэнсавую вартасць (напрыклад, бел-чырвона-белая стужка з 2020 г.) могуць прадавацца на аўкцыёне.

**Прыватныя фонды і карпарацыі**

- У многіх буйных фірмаў (напрыклад, Schwarzkopf) ёсць сацыяльныя праграмы — падтрымліваюць адукацыю, інклюзію, жаночае лідарства.
- Важна чытаць прыярытэты на сайце фонду і пісаць з улікам гэтых прыярытэтаў.

## 5. ІНСТЫТУЦЫЙНАЕ ПАРТНЁРСТВА: АМБАСАДЫ, ЕЗ, МЯСЦОВАЯ ЎЛАДА

**Спосабы супрацоўніцтва**

- Універсітэты: бясплатныя залы, кааперацыя ў правядзенні канферэнцый.
- Французскі інстытут: дае зніжаныя кошты або пляцоўкі для бясплатных мерапрыемстваў.
- Еўрапейскія інстытуцыі:
    - Дом Еўропы (у кожнай краіне),
    - Дэлегацыі Еўразвязу — часта падтрымліваюць культуру і адукацыю.
- Амбасады: падтрымка мерапрыемстваў, інфармацыйныя кампаніі, часам непрамое фінансаванне.

“Амбасады могуць даць залу, распаўсюд інфармацыі, альбо зрабіць супольны івэнт.”

## 6. КАМУНІКАЦЫЯ, КРАЎДФАНДЫНГ І РОЛЯ ГРАМАДСТВА

**Праца з грамадзянамі іншых краін**

- Беларусы павінны звяртацца не толькі да дзяржаваў, але і да людзей:
    - Аператарскай гісторыі пра палітвязняў,
    - Кампаніі, дзе праз палітыкаў, медыя і міжнародныя фонды даносяцца гэтыя гісторыі.

**Кампаніі, якія працуюць:**

- 1% падатку — у Польшчы, Літве, Італіі.
- Канферэнцыі без грошай — калі ўсе партнёры проста даюць свае рэсурсы (памяшканне, арганізацыю).
- Партнёрскія кансорцыумы — адзіную заяўку падаюць некалькі арганізацый больш шанцаў.

## 7. ВЫСНОВЫ І РЭКАМЕНДАЦЫІ

01. Перастаць саромецца грошай — гэта інструмент выжывання.
02. Фінансаванне — гэта праца: сустрэчы, перамовы, пошук інфармацыі.
03. Каб атрымаць — трэба ісці: мясцовая ўлада, банкі, царква, бізнэс.
04. Партнёрства важней за канкурэнцыю: кансорцыумы маюць большае значэнне.
05. Інфармаванасць = магчымасці: беларускія супольнасці павінны ведаць пра інструменты фінансавання і вучыць новых удзельнікаў.

## ДАДАТАК:

### Інстытуцыі і праграмы дзяржаўнага ўзроўню

**Чэхія**

- Міністэрства ўнутраных спраў (MVČR) – гуманітарная праграма для параненых і рэпрэсаваных беларусаў (медыкі, студэнты).
- Міністэрства адукацыі Чэхіі – супрацоўніцтва па стыпендыях і падтрымцы рэпрэсаваных студэнтаў.
- Камітэты нацыянальных меншасцяў:
- Камітэт пры магістратуры г. Прагі,
- Камітэт пры урадаўскіх структурах.

**Італія**

- Прафсаюзы (сіндыкаты) — фінансуюць асацыяцыі, лагеры, культурныя мерапрыемствы.
- 5x1000 (Cinque per mille) — падатковая праграма, дзе можна накіраваць частку падатку на канкрэтную НДА.
- Мясцовыя і рэгіянальныя фонды — падтрымка асацыяцый нават без грантавай сістэмы.
- Sberbank Italia — падтрымка невялікіх ініцыятыў (напрыклад, праект шэльдара).

**Польшча**

- Мэрыя Варшавы — мае праграмы для фінансавання праектаў мясцовых арганізацый, у тым ліку беларускіх.
- Dom Europy (Дом Еўропы) — бясплатныя памяшканні і інфармацыйная падтрымка для НДА.
- Польскія інстытуты — культурная падтрымка (пляцоўкі, прамоцыя).

### Прыватныя фонды і карпарацыі

- Schwarzkopf Foundation (Нямеччына) — падтрымка адукацыйных і асветніцкіх праектаў.
- Фонды палітычных партый (напрыклад, Friedrich Ebert Stiftung, Konrad Adenauer Stiftung, Heinrich Böll Stiftung, Rosa Luxemburg Stiftung).
- Японскія фонды — згадваліся як недастаткова вывучаная магчымасць.
- Глабальныя карпарацыі — маюць сацыяльныя праграмы (часта адукацыя, культура, інклюзія).

### Акадэмічныя і культурныя платформы

- Французскі інстытут (Institut Français) — падтрымка пляцовак для культурных і акадэмічных падзей.
- Універсітэты Еўропы — супрацоўніцтва для канферэнцый, даследаванняў, акадэмічных форумаў.
- EHU, Варшаўскі ўніверсітэт, Чарнігаўская акадэмія і інш. — пляцоўкі і экспертныя супольнасці.



## Грамадскія ініцыятывы і платформы

### Беларускія

- Беларускі Магістрат – супольнасць, якая на працягу 6–9 месяцаў рэгулярна пералічвае грошы на праекты, якія падтрымліваюць:
- выданне кніг,
- падлеткавыя клубы,
- медыйныя ініцыятывы.
- Klub Belaruski – ініцыятыва каардынацыі бізнес-ахвяраванняў у канкрэтныя праекты.
- Платформа 1% для беларусаў у Польшчы — база арганізацыяў, якім можна пералічваць частку падатку.
- Кампетэнтныя базы:
- Партнёрскія базы, у тым ліку ад Маргарыты Вольхавай (спецыялізацыя: моладзь, інклюзія, культура).
- База новых прыватных донараў у ЕС.

### Міжнародныя і мультыінстытуцыйныя механізмы

- EU MFA Civil Society Facility – фінансаванне праектаў грамадзянскай супольнасці.
- BOLST & NEBS (Шведскі інстытут) – рэгіянальныя праграмы, даступныя і для беларусаў.
- EU Delegations (делегацыі ЕС) – магчымасць супрацоўніцтва з еўрапейскімі прадстаўніцтвамі на мясцовым узроўні.
- European Youth Parliament – падтрымка моладзевых ініцыятыў (магчымасць паўторнай актывацыі).
- EED (European Endowment for Democracy) – можа быць выкарыстаны для праектаў грамадзянскай супольнасці.
- UNESCO, UNDP, OSCE – не згадваліся, але згадваліся як “патрэбныя да далейшага вывучэння”.

### Івэнты, дзе магчыма ўдзельнічаць або арганізоўваць

- Кірмаш у Мілане (I Mercati dei Frati) — удзел рамеснікаў, культурнае прадстаўленне Беларусі.
- Канферэнцыі без бюджэта — як прыклад: Варшаўскі івэнт, зроблены цалкам на партнёрстве.
- Выставы, фестывалі, дабрачынныя вечарыны, лекцыйныя туры — як інструмент краўдфандынгу і культурнай дыпламатыі.